# Грамніцы – палавіна зіміцы...

## Традыцыі святкавання Стрэчання (Грамніц) у беларусаў



**Таццяна Кухаронак,**
старшы навуковы супрацоўнік аддзела нарадазнаўства Цэнтра даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры НАН Беларусі, кандыдат гістарычных навук, дацэнт

Каляндар – той надзейны стрыжань, на якім трымаецца традыцыйны лад сялянскага жыцця. У аснове саваёй ён мае добра распрацаваную міфалагічную сістэму, што абумоўлівае сэнс і ў многім – паэтычную вобразнасць рытуальных дзеянняў і песень. Своеасаблівым маркерам года выступае і царкоўна-хрысціянскі каляндар, які вызначае склад, парадак і іерархію адзінак гадавога часу (перш за ўсё свят, пастоў і мясаедаў), а таксама ў значнай ступені іх назваў.

Стрэчанне (Грамніцы) адносіцца да нерухомых каляндарных свят, адзначаецца каталікамі 2 лютага, праваслаўнымі – 15 і шырока бытуе на Беларусі. Свята ўсталявана ў памяць аб сустрэчы (царкоўнаславянскае – Сретение) Немаўляці Хрыста ва Іерусалімскім храме са старцам Сімяонам і Ганнай Прарочыцай (прадстаўнікамі Старога Запавету), якія славілі Збавіцеля. Па старазапаветным законе, у саракавы дзень па нараджэнні хлопчыка-першынца кожная маці павінна была прынесці дзіця ў храм разам з ачышчальнай і ўдзячнай ахвярай Богу, што і зрабілі Божая Маці з Іосіфам. У касцёлах 2 лютага адбываецца свята Ачышчэння Прачыстай Дзевы, якое яшчэ мае назву Маці Божай Грамнічнай.

Напярэдадні свята рыхтавалі спецыяльныя свечкі для асвячэння: яны былі больш доўгія і тоўстыя, чым звычайныя. Гаспадары, у якіх у гаспадарцы меліся пчолы, выраблялі («сучылі», «качалі») свечкі для свайго дому, сваёй радні, а таксама на продаж з прыхаванага воску, вытапленага абавязкова з выкачаных пчаліных сотаў, які яшчэ нідзе не выкарыстоўваўся да гэтага. Раней толькі нямногія вяскоўцы куплялі гатовыя свечкі ў царкве (касцёле), у гарадскіх крамах, аддаючы перавагу свечкам хатняга вырабу. «На Грамніцы свечкі асвяшчалі. Наш папа быў пчалавод, мы перад Грамніцамі станавіліся, мама, бабушка прыходзіла, і качалі свечкі. А на Грамніцы насілі асвяшчаць. У мяне яшчэ ёсць дзве свае свечачкі, што мы з мамай рабілі» (Ганна Гарунова, 1939 г.н., в. Пекалін, Смалявіцкі раён, Мінская вобласць). «У нас пчолы былі, тата сам дзелаў свечкі, тоўстыя такія і радне сваёй раздаваў. К Стрэчанню дзелаў і насіў у цэркаў у Бялынічы пасвяцаць яе, свячу. Если хто памрэць – туда свечку насілі ат нас і мёду трошачкі. Если свадзьба – тожа ўстрачалі са свячой маладых, у таты бралі свячу» (Ганна Маргунова, 1940 г.н., в. Машчаніца, Бялыніцкі раён, Магілёўская вобласць). На свечку, якую рыхтавалі для асвячэння, навязвалі льняную ці суконную нітку, якая, паводле меркавання вяскоўцаў, валодала гаючымі ўласцівасцямі: ёю абвязвалі руку ў час жніва, каб не параніцца, пры болях у нагах і спіне.

У гэты святочны дзень у цэрквах (касцёлах) асвячаюцца васковыя свечкі, якія завуцца грамнічнымі: «Грамніцы втарога февраля, ужо мы сьвенцім сьвечкі, яны памоцныя» (Соф'я Сахар, 1924 г.н., в. Старына, Стаўбцоўскі раён, Мінская вобласць). Па тым, як гарэла свечка падчас набажэнства, вызначалі, якім будзе наступнае лета: «...і вот як гараць ціха сьвечкі – будзе ціхае лета, як гараць і трашчаць – ета ўжо грымоты будуць» (Галіна Лук'янцава,

1920 г.н., в. Каменка, Уздзенскі раён, Мінская вобласць); «То ж Грамніцы, свічкі свіцяць. Бацюшка як пасвяціць, тыя свічкі запалюют у цэркві: як вжэ трыскаюць – то будэ дожджліво, будэ гром, грыміты й трэшчаты» (Марыя Дацык, 1928 г.н., в. Олтуш, Маларыцкі раён, Брэсцкая вобласць).

Агонь – адна з першасных стыхій, якая ўдзельнічала ў акце стварэння свету і якую ўшаноўвалі нашы продкі яшчэ ў далёкія дахрысціянскія часы, у міфалагічных уяўленнях супрацьстаіць вадзе. З цягам часу даўнія міфалагічныя ўяўленні пра культ агню зніталваліся-перапляліся з хрысціянскімі, а іх арганічнае адзінства ўвасобілася ў шэрагу звычаяў і абрадаў. Старажытны культ агню выразна ўвасобіўся ў грамнічнай/стрэчаньскай свечцы: яе агеньчык прыраўноўваўся да «жывога» агню.

Пасля прыходу з царквы (касцёла) выконвалі шэраг абрадаў. Запаленай свечкай крыжападобна абпальвалі валасы на галаве ўсіх насельнікаў, у першую чаргу дзяцей: «На Грамніцы, я помню, баба прыдзе с цэрквы, нас усіх застрыгала: кругом галавы абводзіць свечачкаю і тры разы падпаліць валосікі і патушыць – у трох мястах. Эта, штоб галава не балела, для здароўя. Эта самая глаўная мы чакалі, што баба прыдзе с цэрквы і будзе нас усіх застрыгаць. І яшчэ так рабіла: падыдзе ў адзін вугал, свечка гарыць, яна перакрысціцца і ідзе ў другі вугал, і так ва ўсех комнатах, з запаленай свечкай. Эта каб у хаце дабрабыт быў, каб хата сахранілася ад пажару, ад усякіх бед» (Галіна Сіневіч, 1944 г.н., в. Мядзьвятка, Карэліцкі раён, Гродзенская вобласць). Пасля гаспадар датыкаўся полымем свечкі да кожнай сцяны, вушакоў дзвярэй у хаце, астатніх гаспадарчых збудаванняў, а таксама ў пчальніку пры кожным вуллі. «Тры крэсціка зробляць, этым дымком от свічкі – на столі, на бальцы, каля покуця. А потом ужэ ўсім дзяткам подпаляць косы, каб не бояліся, як грыміць. За таго і зовуць «Громніцы», бо подпальвалі дзітэм косы, каб не бояліся грому. І старым подпальвалі, хто боіцца грому» (Вольга Стасюк, 1928 г.н., в. Вулька-1, Лунінецкі раён, Брэсцкая вобласць. Зап. А. Боганевай, Т. Валодзінай, 2007 г.).

Па заканчэнні абыходу сядзібы свечку тушылі, абгортвалі тканінай і захоўвалі за абразамі, на стале ў бутэльцы з зернем або ў куфры (скрыні, бажніцы і да т.п.). Якая б падзея надалей ні здарылася ў сям'і – радасная або нешчаслівая, заўсёды запальвалі грамнічную свечку. Гэта рабілася падчас прыняцця павітухай нованароджанага, пры адпраўленні яго да хрышчэння, прыходзе сватоў і на традыцыйным вяселлі, пры выпраўленні кагосьці з членаў сям'і ў далёкі шлях. Спадзяваліся



Грамнічная свечка. Смалявіцкі раён. Фота Т. Кухаронак

на дапамогу грамнічнай свечкі і ў падтрыманні здароўя: «Усе садзяцца: кажнага абносяць той сьвечкай – гаспадара першага абносяць, тады дзяцей. І трэба выпаліць валасоў трошкі крэсьцікам, каб галава не балела» (Соф'я Турко, 1927 г.н., в.Ператокі, Стаўбцоўскі раён, Мінская вобласць). Лячыліся ёю ад сурокаў і сполаху: «Грамнічнай сьвечкай абносілі дзяцей, як спужаецца» (Марыя Гарошка, 1914 г.н., в. Осава, Бярэзінскі раён, Мінская вобласць). Паўсюдна яна выкарыстоўвалася ў пахавальным абрадзе, бо, паводле народнага меркавання, аблягчала пакуты паміраючаму, якому запаленую свечку давалі ў рукі. «Як чалавек умірая, нада даваць гэту сьвечку» (Соф'я Сахар, 1924 г.н., в. Старына, Стаўбцоўскі раён, Мінская вобласць).

Асабліва ж патрэбнай была гэтая рэч для засцярогі ад навальніцы і ад пажару. «Мы ж баяліся дзеці гразы, дак ад гразы бабка брала грамнічную свечку, чытала малітву і дзелала крэсцікі свечкай над акном, над дзвярамі. Запальвала яе і выжыгала этыя крэсцікі. Эта я добра помню» (Тамара Калганава, 1950 г.н., в. Ляўкі, Старадарожскі раён, Мінская вобласць).



З грамнічнай свечкай да кароўкі…
в. Новае Палессе, Лельчыцкі раён. Фота Т. Кухаронак

«Грамнічную сьвечку ад гразы палілі, каб хату абышла хмара. Раньша ж грозы страшныя былі, як мая маці казала, палавая хмара ідзе, яна аж ліловая ўся» (Ганна Пушкарчук, 1947 г.н., в. Каменка, Уздзенскі раён, Мінская вобласць); «На Грамніцы асвячаюць свечкі. Як грыміць гром, як вялікая бура, дак ставяць гэту свечку на акно – тады Божанька абносіць» (Браніслава Кандуховіч, 1927 г.н., в. Рубяжэвічы, Стаўбцоўскі раён, Мінская вобласць).

Выкарыстоўвалі грамнічную свечку на Каляды, калі абыходзілі ўсе збудаванні на сядзібе, і з аналагічнай мэтай на Вадохрышчы, пры разгаванні на Каляды і на Вялікдзень, пры перадтрапезнай малітве на Дзяды. Неабходным атрыбутам свечка была пры першым выгане жывёлы ў поле: «З грамнічнай сьвечкай абходзілі, як гнаць у поля карову. Запалівалі і абносілі, каб не блудзіла, каб усё добра было, каб дамоў прыходзіла» (Ніна Дарваед, 1932 г.н., в. Ганцаўская Слабада, Лагойскі раён, Мінская вобласць. Зап. Т. Валодзінай). Зараз гэты мікраабрад амаль не выконваецца з-за рэзкага скарачэння колькасці кароў на вёсках, але добра захоўваецца ў памяці інфармантаў.

Ва ўсіх гэтых выпадках грамнічная свечка запальвалася, але і незапаленая яна служыла верасцярогай ад нячыстай сілы і ведзьмаў. Для гэтага яе вывешвалі на ноч да верхняга дзвярнога касяка ў хаце або хлявах. З той жа незапаленай свечкай сяляне выконвалі разнастайныя сельскагаспадарчыя работы – пашу, касьбу, жніво, малацьбу, а таксама закладалі пачатак будаўніцтва хаты і г.д.



Ёлка на Стрэчанне. в. Новае Палессе, Лельчыцкі раён. Фота Т. Кухаронак

Выкарыстоўваліся ў сялянскім побыце не толькі самі грамнічныя свечкі, але і сплавы ад іх. Апошнія насіліся як амулеты на целе, даваліся людзям у якасці лекаў, імі падкурваліся пры сполахах і ліхаманках. Грамнічная (стрэчаньская) свечка захоўвалася ў кожнай хаце на працягу года, як святыня; яе нікому не пазычалі, нават самай блізкай радні.

Да сёння ў асяроддзі вяскоўцаў Беларусі грамнічная свечка займае значнае месца сярод рытуальных прадметаў, якія выкарыстоўваюцца ў разнастайных абрадавых, ахоўных, магічных, лекавальных мэтах. «Я, як прыхожу с цэрквы, зь ёю абхожу ўсе свае пастройкі, хату, сараі, каб ачысьціць. У хаце кажды вугалочак: с парога начынаю і, кажуць, нада па сонцу хату абыходзіць» (Ганна Пушкарчук, 1947 г.н., в. Каменка, Уздзенскі раён, Мінская вобласць); «І мы яшчэ крыжык дымам палім у дзьвярах, валасэ падпальваем, каб не забіла маланка. І цэлы год гэты крыжык не сціраюць» (Соф’я Сахар, 1924 г.н., в. Старына, Стаўбцоўскі раён, Мінская вобласць). У сучасны перыяд сфера выкарыстання гэтай сакральнай рэчы пашыраецца: «Калі едзе ў дарогу, у машыне тожа нада грамнічная сьвечка» (Соф’я Букатая, 1920 г.н., в. Сяліба, Бярэзінскі раён, Мінская вобласць).

З аналізу экспедыцыйных матэрыялаў становіцца відавочна, што адной з дамінантаў гэтага свята, як і іншых святочных каляндарных дат, і адначасова праявай яго шанавання з’яўляецца адмова ад працы: «Стрэчаньне празнуем, ня робім нічога» (Вольга Міхнавец, 1937 г.н., в. Ананьчыцы, Салігорскі раён, Мінская вобласць); «Грамніцы сьвяткавалі сваёй сям’ёй, работаць нельзя» (Ганна Жардзецкая, 1922 г.н., в. Петрышкі, Мінскі раён, Мінская вобласць); «Грамніцы знаю. Што рабілі? На свята ж нічога ня робяць, ані, святкуюць» (Марыя Шэршань, 1928 г.н., в. Алесіна, Смалявіцкі раён, Мінская вобласць).

У традыцыйнай свядомасці, у народнай назве свята гэты дзень устойліва ўспрымаецца як сустрэча зімы з летам, пераломам у прыродным бегу: «Ад Грамніцы – зіма палавіцы» (Ганна Жардзецкая, 1922 г.н., в. Петрышкі, Мінскі раён, Мінская вобласць); «Стрэчаньне – зіма з летам устрачаюцца» (Вольга Казачок, 1932 г.н., в. Клінок, Чэрвеньскі раён, Мінская вобласць); «На Грамніцы ажываюць усе крыніцы, трэба напіцца вады с крыніцы» (Вера Дашко, 1932 г.н., в. Касцяшы, Уздзенскі раён, Мінская вобласць). «Стречанне канешне ж было, зіма з летам устрячаецца: «Здрастуй, лета красівае! – Здароў, зіма саплівая!» – бабы так гаварілі» (Раіса Нікіценка, 1935 г.н., в. Арловічы, Дубровенскі раён, Віцебская вобласць).

На поўдні Беларусі да Стрэчання былі прымеркаваны ачышчальныя абрады, калі распачыналася паленне вогнішча, дзе спальвалі старызну, што характэрна для веснавых свят у цэлым. «Вечарам сабіраюцца на выгані, несьлі ўсё старое – лапці, да ўжо стоптаныя ўсе, старыя, ну, ўсё-ўсё такое непатрэбнае, палілі агонь, тое староцьце палілі. І там ужэ весяліліся, зноў песьні пелі» (Аляксандра Бялоцкая, 1930 г.н., в. Новае Палессе, Лельчыцкі раён, Гомельская вобласць); «На Стрэчаньне, гаварылі, кашалі старыя, дыравыя, обуў усякую зьбіралі, клалі касцёр пасрэдзі дзярэўні і спальвалі эта. Бацькі нам гаварылі, што так нада зрабіць. Іменна дзеці: кажды цягнуў з дому кашалі этыя і ўсё гэта старая сжыгалі. Іменна было на Стрэчаньне» (Іосіф Ілюшчыц, 1926 г.н., в. Рог, Салігорскі раён, Мінская вобласць).

У дзень Стрэчання вяскоўцы ўважліва сачылі за надвор'ем, бо, на іх думку, характар надвор'я ў гэта пераломнае свята мог прадказаць характар будучай вясны і лета, будучы ўраджай: «Нада, штоб са страхі бегла вада і певень напіўся – тады вясна ранняя будзе і харошы год будзе, уражай будзе» (Соф'я Букатая, 1920 г.н., в. Сяліба, Бярэзінскі раён, Мінская вобласць). Лічылі, калі ў згаданы дзень крыху растане снег, то вясной ужо на Юр'я будзе на лугах трава, аб чым і гаворыцца ў беларускай народнай прыказцы: «Калі на Грамніцы певень нап'ецца вадзіцы, то на Юр'я вол наесца травіцы». Наадварот, моцны мароз на Грамніцы сведчыў аб хуткім раставанні снегу на палях, і ў такім выпадку вясна і лета не абяцалі селяніну нічога добрага. Рэзкае пацяпленне ў гэты дзень прадказвала дрэнны ўраджай, што таксама знайшло адлюстраванне ў фальклоры: «Калі на Грамніцы адліга – з ураджаю будзе хвіга». Трывогу ў душу селяніна пасяляла і мяцеліца, што мяла на Грамніцы, бо яна сведчыла аб доўгай зацяжной вясне, у выніку чаго мог скончыцца корм для скаціны раней, чым з'явіцца трава на лугах.

У некаторых лакальных традыцыях ад Стрэчання пачыналі гукаць вясну, співаць вяснянкі і, нягледзячы на холад, выходзілі з песнямі на вуліцу, на сенавалы, у пуні. Зачын «Зіма з летам сустракаецца» – вызначальны для песень гэтага часу. «У нас сёння Стрэчанне, Стрэчанне, зіма з летам стрелася, стрелася, лета зіму піхнула, піхнула, зіма ножку звіхнула, звіхнула, пашла зіма плачучы, плачучы, лета прышло скачучы, скачучы. Эта ў нас так пелі на Стрэчанне, тады зіма з летам сустракаецца» (Ніна Камарова, 1941 г.н., в. Кісялёва Буда, Клімавіцкі раён, Магілёўская вобласць). Самым яркім атрыбутам стрэчаньскага гукання вясны на Гомельшчыне з'яўляецца ўпрыгожанае хваёвае дрэўца – ёлка, сасонка. «На Стрэчаньне ў нас гукалі вясну, карагод, ёлку рабілі, лезлі на хлеў, на сарай да ўжо вясну гукалі, ёлку нараджвалі» (Анастасія Астаповіч, 1931 г.н., в. Дуброва, Лельчыцкі раён, Гомельская вобласць); «Зробім ёлку з дзерэва, да кругом села пройдом. Ёлку таку зробім маленьку, да возім на санках, да отмечаем. Сьпевалі песьні. Там на хрэст поставім тую ёлку» (Аляксандра Бялоцкая, 1930 г.н., в. Новае Палессе, Лельчыцкі раён, Гомельская вобласць). Павадзіўшы карагод, жанчыны прывязвалі ёлку да крыжа з надзеяй і верай, што яна поруч з іншым будзе ахоўваць вёску і яе жыхароў ад усялякага зла.

Дарэчы, ялінка функцыянуе ў якасці абрадавага дрэўца ў калядна-навагодніх, масленічных, троіцкіх і купальскіх святкаваннях, а таксама на вяселлі і пры будаўніцтве хаты. У замовах яна выступае ў якасці сусветнага дрэва. Такое выкарыстанне елкі абумоўлена яе сімволікай вечнасці, ідэяй сувязі светаў і станаў, што ўпісвалася ў больш агульную ідэю, асноўную для каляндарных свят, якія сімвалізавалі пераход ад адной пары года да другой.

З асаблівай нецярплівасцю чакалі Стрэчання падлеткі, для якіх гэты дзень быў сапраўдным святам з пачастункам.

У шэрагу беларускіх вёсак на Стрэчанне святкавалі прастольнае свята: «Стрэчаньне – эта ў нас прастольны празьнік. Пован двор вазоў, напрыязджаюць, коні папрывязуюць. Гасьціна вялікая, усе ротсцьвеннікі зьбіраюцца. На празьнік багата нагатаўляліся. Дзядзька мой на скрыпку йграў, дык усё сяло сходзілася. Мы на печы сядзелі, бо нам ногі аттоптывалі. Як німа скрыпача, дак яны бяруць качалкі, тыя, што бяльлё і – трында-трында. І бубен – і так ужо танцуюць, што пол трашчыць. Дай, Божачка, як весела было!» (Алена Гурыновіч, 1930 г.н., в. Церабаў, Петрыкаўскі раён, Гомельская вобласць); «Стрэчаньне, мы эты празьнік усегда празнавалі. Встрачаліся людзі, давольныя, старшыя самі с сабою, сабіраліся, гасьціліся, маладыя – аддзельна» (Зінаіда Галавацкая, 1941 г.н., в. Заходняя Морач, Салігорскі раён, Мінская вобласць).

У сучасны перыяд сярод беларускіх вяскоўцаў, а таксама і гараджан захоўваюцца традыцыйныя вераванні, звязаныя са святам Стрэчання/Грамніц, уяўленні аб сакральнай моцы стрэчаньскіх/грамнічных свечак, што, трапляючы пад асвячэнне, тым самым падвойваюць свае магічныя ўласцівасці. Іх жыццеўстойлівасць падтрымліваецца традыцыйнымі светапоглядными ўяўленнямі беларусаў аб свяце наогул як незвычайным, «сакральным» часе, які проціпастаўляецца будням.